УДК 94 (476 – 15) + 94 (438)

*В.І. КРЫВУЦЬ*

# КУЛЬТ АСОБЫ Ю. ПІЛСУДСКАГА ЯК ЭЛЕМЕНТ ДЗЯРЖАЎНАЙ МАЛАДЗЁЖНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў 2-й РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

*Артыкул прысвечаны фарміраванню і развіццю культу маршала Юзефа Пілсудскага як часткі афіцыйнай маладзёжнай палітыкі ў міжваеннай польскай дзяржаве. Падрабязна характарызуюцца падыходы кіраўніцтва сістэмы адукацыі 2-й Рэчы Паспалітай да асобы лідэра "санацыі", а таксама фарміраванне яго культу ў польскай школе, у тым ліку і на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Асобна асвятляецца тое месца, якое займала "лягенда маршала" ў ідэалогіі вядучых праўрадавых маладзёжных саюзаў і аб'яднанняў. У артыкуле выкарыстоўваюцца разнастайныя дакументальныя матэрыялы.*

## Уводзіны

Культ асобы лідэра "санацыі" маршала Ю. Пілсудскага з'яўляўся неад'емнай часткай грамадска-палітычнага жыцця 2-й Рэчы Паспалітай, у тым ліку і на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ў міжваенны перыяд знаходзілася ў складзе польскай дзяржавы. Розныя аспекты гэтай праблематыкі ў той ці іншай меры знайшлі адлюстраванне ў сучаснай польскай гістарыяграфіі. Што тычыцца айчыннай гістарычнай навукі, то, на жаль, дадзенае пытанне яшчэ не знайшло належнага асвятлення. Мэтай артыкула з'яўляецца хаця б часткова запоўніць гэты прабел, разглядаючы культ Ю. Пілсудскага як элемент дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, які аказваў значны ўплыў на фарміраванне "санацыйнай" мадэлі выхавання маладога пакалення заходнебеларускага рэгіёна. На нашу думку, гэта дазволіць скласці больш аб'ектыўнае ўяўленне не толькі аб маладзёжнай палітыцы польскіх улад у міжваенны перыяд, але і аб грамадска-палітычным жыцці Заходняй Беларусі ў цэлым.

## Асноўная частка

Пасля таго, як у маі 1926 г. да ўлады ў 2-й Рэчы Паспалітай прыйшоў лагер "санацыі", у сферы маладзёжнай палітыкі стала ажыццяўляцца канцэпцыя так званага "дзяржаўнага выхавання". Неабходна адзначыць, што на працягу міжваеннага перыяду дадзеная канцэпцыя прайшла даволі складаную эвалюцыю, але пашырэнне культу асобы маршала Ю. Пілсудскага заўсёды заставалася важным яе элементам. Фактычна гэты культ стаў неад'емнай часткай "санацыйнай" мадэлі выхавання. Стваральнікі мадэлі нават лічылі маршала ідэальным прыкладам выхаваўцы. Так, А. Скварчыньскі, адзін з вядучых "санацыйных" ідэолагаў, адзначаў, што "Пілсудскі не з'яўляецца ні тэарэтыкам, які вылушчвае паняцці насуперак жыццю, ні дактрынёрам, што шукае мёртвыя прынцыпы. Ён менавіта выхавацель. Ён, як ніхто іншы, бачыць і чуе жыццё і яго законы" [1, с. 14]. Ужо пасля смерці маршала адзначалася, што яго ідэйная спадчына – гэта поўная выхаваўчая сістэма, аўтар якой сам прэзентаваў "выхаваўчы ідэал, вызначыў ідэйныя шляхі польскай педагагічнай думкі і паказаў метады выхаваўчай работы, якія адпавядаюць нашай нацыянальнай псіхіцы". Таксама лічылася, што моладзь не зможа стаць ідэйнай, быць гераічнай і вялікай, калі яе фарміраваць у духу нянавісці ці прыхільнай паблажлівасці да тых, хто даў Польшчы незалежнасць. У першую чаргу да такіх людзей адносіўся маршал Ю. Пілсудскі, з якога неабходна было стварыць "сімвал грамадзянскасці" [2, с. 305-306].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прыхільнікамі культу асобы польскага дыктатара з'яўляліся кіраўнікі сістэмы адукацыі 2-й Рэчы Паспалітай. Так, К. Світальскі, міністр рэлігійных веравызнанняў і публічнай асветы, лічыў, што ўвядзенне ў выхаваўчую практыку культу асобы Ю. Пілсудскага з'яўляецца адным з прыярытэтаў. Яго пераемнікі былі цалкам з ім згодны і актыўна насаджалі гэты культ. Так, у лютым 1931 г. міністр С. Чэрвіньскі заяўляў, што толькі сляпая ад палітычнай нянавісці партыйнасць можа патрабаваць выкрэсліць з праграмы грамадзянскага выхавання асобу, “якая, дзякуючы сваёй ахвярнай службе дзяржаве, стала лепшым сімвалам і прыкладам”. Таксама ён сцвярджаў, што немагчыма выхоўваць моладзь на прыкладзе чужых герояў і замоўчваць фігуру “самага вялікага героя нашай уласнай вызваленчай вайны” [3, с. 78].

Наступны міністр, Я. Енджэевіч, таксама ў час дэбатаў у сейме, заявіў: “Наш суд аб гісторыі аднаўлення нашай незалежнасці вызначаны; у тых падзеях мы добра адрозніваем людзей, якія не шкадавалі свайго жыцця і крыві, людзей дзеяння, рашэння, барацьбы і адказнасці і людзей баязлівасці, пагаднення. І будзем – напэўна будзем пашыраць культ адных і пагарду да другіх. І ўлічваючы, што асоба маршала Пілсудскага з'яўляецца жывым сімвалам таго ўзнёслага, таго, што ёсць адным з самых лепшых выхаваўчых узораў у нашай традыцыі, польская школа павінна пашыраць і культываваць любоў і павагу да яго” [2, с. 307]. Неабходна адзначыць, што гэты культ сапраўды актыўна пашыраўся і насаджаўся да верасня 1939 г.

Гэта можна добра прасачыць на прыкладзе вывучэння гісторыі ў школе. З эпізодамі жыцця Ю. Пілсудскага вучні пачыналі знаёміцца яшчэ ў пачатковых класах. У праграмах і падручніках па гісторыі, якія выйшлі пасля школьнай рэформы 1932 г., асоба маршала актыўна выстаўлялася ў якасці асабістага ўзору для кожнага грамадзяніна польскай дзяржавы. Яго біяграфія падрабязна асвятлялася на ўроках гісторыі і старонках падручнікаў. Асабліва падкрэслівалася рашаючая роля Ю. Пілсудскага, якую той адыграў у аднаўленні незалежнасці Польшчы. У праграме для ўсеагульнай школы першай ступені навучання абавязковымі тэмамі былі наступныя: “Ю. Пілсудскі – Начальнік адроджанай польскай дзяржавы” і “Пераход улады ў адроджанай польскай дзяржаве да Ю. Пілсудскага”; у праграме для школы другой ступені – “11 лістапада, пераход улады да Ю. Пілсудскага” і “З барацьбы за вызваленне частак дзяржавы, Начальнік дзяржавы і Галоўнакамандуючы Ю. Пілсудскі”; у праграме школы трэцяй ступені – “Начальнік дзяржавы Ю. Пілсудскі” [4, с. 31]. Праграмы рэкамендавалі, каб у выпадку вывучэння гісторыі войнаў за ўсталяванне межаў 2-й Рэчы Паспалітай асоба маршала паказвалася “манаграфічна” [2, с. 313]. Такім чынам, асвятляючы ход польска-савецкай вайны, аўтары падручнікаў пры кожным зручным выпадку праслаўлялі асобу польскага дыктатара. Стваралася ўражанне, што іншых военачальнікаў быццам бы і не існавала, а Ю. Пілсудскі сам кіраваў усімі ваеннымі дзеяннямі. Гэта быў яскравы прыклад “дзяржаўнага выхавання”, у якім моцны націск рабіўся на падкрэсліванне значэння ў жыцці дзяржавы выдатных гістарычных асоб, увасабленнем якой лічыўся Ю. Пілсудскі [4, с. 33].

Што да Заходняй Беларусі, то мясцовае кіраўніцтва сістэмы адукацыі не засталося ў баку ад пашырэння культу Ю. Пілсудскага. Асабліва актыўна дзейнічала кіраўніцтва Віленскай школьнай акругі, паколькі маршал быў ураджэнцам менавіта Віленшчыны, а школьныя праграмы прадугледжвалі ўлічваць пры навучанні рэгіянальны аспект. У сувязі з гэтым па ініцыятыве кіраўніцтва Віленскай школьнай акругі пачалося выданне спецыяльных дыдактычных дапамож-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

нікаў для настаўнікаў усеагульных школ, прысвечаных сувязям маршала з “усходнімі крэсамі”. Ва ўступе да аднаго са зборнікаў адзначалася, што асоба Ю. Пілсудскага “звязвае наш рэгіён з Польшчай мацней, чым многія гістарычныя акты, пакрытыя патынай стагоддзяў” [2, с. 132]. У іншым выданні падкрэсліваліся “глыбока асабістыя, сыноўскія” адносіны маршала з роднай Віленшчынай. З замілаваннем былі апісаны яго візіты на радзіму пасля замацавання Віленскага края ў складзе 2-й Рэчы Паспалітай. Асабліва падкрэсліваліся прыязныя адносіны мясцовага насельніцтва са сваім земляком, які «ахвотна размаўляў з сялянамі, якія, што цікава, былі нават смялейшымі ў адносінах з Ім, чым самае бліжэйшае атачэнне. Люд Віленскай зямлі моцна верыў у апеку і ўсемагутнасць маршала. Усё, што лічылася несправядлівасцю ці крыўдай, зараз жа атрымлівала каментар: “Мусіць маршал Пілсудскі аб гэтым не ведае, бо каб ведаў, то такога б не было”» [5, с. 18].

Культ Ю. Пілсудскага ў школе не абмяжоўваўся толькі непасрэдна школьнымі заняткамі. Важнай часткай школьнага жыцця і дзейнасці розных праўрадавых арганізацый было святкаванне 19 сакавіка імянін маршала Ю. Пілсудскага. З 1931 г. гэты дзень быў зроблены вольным ад заняткаў ва ўсіх установах адукацыі 2-й РП. Зразумела, што нагодай да дэманстрацыі вернападданніцкіх пачуццяў у адносінах да дыктатара з’яўляліся і іншыя святы – Дзень незалежнасці, гадавіна бітвы пад Варшавай, юбілеі нацыянальна-вызваленчых паўстанняў.

Спецыфічнай формай культу Ю. Пілсудскага стала наданне яго імя ўстановам адукацыі. Акрамя ўсяго іншага, гэта давала магчымасць правесці адпаведныя ўрачыстасці, у час якіх асоба маршала ставілася ў прыклад маладому пакаленню. Моладзі даводзілася, што яна павінна ганарыцца такім патронам, дзякуючы якому ў іх існавала магчымасць вучыцца ў польскай школе. Трэба адзначыць, што Міністэрства рэлігійных веравызнанняў і публічнай асветы ставіла пэўныя патрабаванні да школ, якія імкнуліся атрымаць імя Ю. Пілсудскага. Так, напрыклад, школа павінна была быць “высокаарганізаванай”. Гэта азначала, што права атрымаць маршала ў якасці патрона пазбаўляліся невялікія школы. Але маглі быць і выключэнні, асабліва калі справа тычылася школ, якія дзейнічалі менавіта на тэрыторыі “усходніх крэсаў”. Міністэрства магло пайсці на саступкі, калі з просьбай аб наданні школе імя Ю. Пілсудскага звярталіся бацькі польскіх дзяцей, вучняў дадзенай школы. У другой палове 1930-х гг. гэтая акцыя набыла спекулятыўныя формы. Міністэрства пачало падтрымліваць праекты масавага будаўніцтва школ імя Ю. Пілсудскага ў паўночна-ўсходніх ваяводствах краіны. Так, план будаўніцтва ў Палескім ваяводстве 100 школ – помнікаў Ю. Пілсудскаму атрымаў у якасці дадатковага фінансавання 1 600 000 злотых. Гэтыя фінансавыя інвестыцыі стымулявалі кіраўніцтва заходнебеларускіх школьных акруг. Паміж імі нават пачалося своеасаблівае спаборніцтва. Куратар Палескай школьнай акругі запланаваў будаўніцтва 950 школьных будынкаў, кіраўніцтва Віленскай школьнай акругі дэкларавала стварэнне аб’ектаў з 300 класнымі памяшканнямі. Трэба адзначыць, што палескі план першапачаткова выклікаў сумненні ў Варшаве. Аднак палескі школьны куратар здолеў пераканаць сваё кіраўніцтва, заявіўшы, што “памкненнем педагагічных работнікаў акругі з’яўляецца ўшанаванне памяці маршала ў самым вялікім памеры, на які нас можа хапіць” [3, с. 322].

Цікава, што ў некаторых выпадках культ асобы Ю. Пілсудскага ў 2-й РП мог набываць формы, яўна запазычаныя ў суседнім сталінскім СССР. Пасля смерці маршала існавала нават прапанова перайменаваць Віленшчыну ў Зямлю Пілсудскага, а саму Вільню – у Зюк (па аднаму з псеўданімаў Ю. Пілсудскага).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Але гэтая прапанова ўсё ж не была рэалізавана. Тым не менш, быў прыняты спецыяльны закон, які ахоўваў памяць маршала. Таксама быў створаны Галоўны камітэт уганаравання памяці Ю. Пілсудскага, адной з задач якога было і выхаванне моладзі ў адпаведным духу [6, с. 243–244].

Неабходна адзначыць, што школа не была адзіным месцам, дзе польскія ўлады імкнуліся распаўсюджваць культ свайго лідэра. Як вядома, асноўная частка моладзі 2-й Рэчы Паспалітай, асабліва на тэрыторыі Заходняй Беларусі, мела магчымасць вучыцца толькі ў пачатковых класах усеагульнай школы. Пасля гэтага яна як бы выходзіла з-пад выхаваўчых уплываў "санацыйнай" сістэмы адукацыі. Зразумела, што правячыя колы міжваеннай польскай дзяржавы не маглі мірыцца з такой сітуацыяй. Таму важная роля ў ажыццяўленні канцэпцыі "дзяржаўнага выхавання" адводзілася шматлікім праўрадавым маладзёжным арганізацыям, якія дзейнічалі ў мэтах інтэграцыі шырокіх мас моладзі ў "працу для дзяржавы".

Да найбольш вядомых праўрадавых саюзаў моладзі, якія актыўна дзейнічалі і на тэрыторыі паўночна-заходніх ваяводстваў 2-й РП, адносіліся Стралецкі саюз "Стралец", Саюз сельскай моладзі "Сеў" – Саюз маладой вёскі, Саюз польскага харцэрства (СПХ), Легіён маладых (ЛМ). Кожная з гэтых арганізацый мела свае спецыфічныя мэты і канкрэтныя задачы, арганізацыйныя прынцыпы і метады працы. Аднак для ўсіх праўрадавых аб'яднанняў агульным было тое, што яны актыўна падтрымлівалі і прапагандавалі культ асобы маршала Ю. Пілсудскага сярод моладзі.

Найбольш яскрава гэта бачна на прыкладзе Стралецкага саюза, які лічыўся прадаўжальнікам традыцый ваенізаваных стралецкіх арганізацый, створаных Ю. Пілсудскім яшчэ напярэдадні Першай сусветнай вайны ў час барацьбы за аднаўленне польскай незалежнасці. Праграмныя дырэктывы ў галіне выхавання членаў "Стральца" лічылі абавязковым "пазнаёміць моладзь з жыццём, дзейнасцю і заслугамі маршала Пілсудскага, як стваральніка Стралецкага саюза і вялікага будаўніка сучаснай Польшчы". Стралецкае ідэйна-палітычнае мысленне павінна было абапірацца на разуменні гістарычнай ролі Ю. Пілсудскага і "ідэйнай сувязі яго намаганняў з арганізацыйнай і легіянерскай традыцыяй і сучаснай дзяржаўнай ідэяй" [7, с. 23].

Выхаванне стральцоў у адпаведным духу адбывалася самымі рознымі шляхамі. Так, напрыклад, іх, як і школьнікаў, актыўна прыцягвалі да ўдзелу ў святкаванні імянін маршала Ю. Пілсудскага. Адным з накірункаў выхаваўчай працы сярод членаў "Стральца" было заахвочванне чытання. Усе члены арганізацыі павінны былі быць сталымі чытачамі мясцовых бібліятэк, пры кожным атрадзе саюза стваралася бібліятэка. Пры гэтым большая частка рэкамендаванай стральцам да чытання літаратуры была прысвечана дзейнасці Баявой арганізацыі Польскай сацыялістычнай партыі, польскай вайсковай арганізацыі, польскіх легіёнаў – гэта значыць арганізацый, створаных Ю. Пілсудскім. Таксама выхаванне ў Стралецкім саюзе ахоплівала і вывучэнне гісторыі Польшчы. Асаблівая ўвага пры гэтым надавался прыкладам, "у якіх доблесць польскай арміі пакрыла славай польскі народ сярод іншых народаў". Зразумела, што такія прыклады ўключалі і дзейнасць польскіх легіёнаў у час Першай сусветнай вайны і бітву пад Варшавай [8, с. 163]. Тут праграма "Стральца" шмат у чым перакплікалася са школьнай праграмай. Гэта можна растлумачыць тым, што вясковая моладзь, якая складала аснову Стралецкага саюза, з падлеткавага ўзросту ў асноўнай сваёй масе заставалася па-за выхаваўчым уплывам усеагульнай школы. Таму польскія

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўлады і імкнуліся гэта кампенсаваць. Усе выхаваўчыя мерапрыемствы "Стральца" павінны былі "падрыхтаваць і прывучыць да дзейснага ўдзелу ў агульнай працы свайго асяроддзя, выпрацаваць дух боегатоўнасці ў адносінах да ўнутраных і знешніх ворагаў у адпаведнасці з указаннямі стваральніка Стралецкага саюза – будаўніка сучаснай Польшчы, 1-га маршала Ю. Пілсудскага" [8, с. 6].

У падобным жа рэчышчы адбывалася і выхаваўчая дзейнасць Саюза сельскай моладзі "Сеў" – Саюза маладой вёскі. У якасці выхаваўчага ідэалу ім быў абраны баец-работнік, узорам якога была асоба Ю. Пілсудскага. Арганізацыя ставіла перад сабой задачу: "выхоўваючы душу маладога вясковага чалавека згодна з ідэйнымі прынцыпамі правадыра народа маршала Ю. Пілсудскага, стварыць дасканалага грамадзяніна, які ўсведамляе свае правы і абавязкі" [9, с. 1].

Самы масавы саюз школьнай моладзі 2-й Рэчы Паспалітай – Саюз польскага харцэрства – пасля таго, як у пачатку 1930-х гг. прыхільнікі "санацыі" захапілі ў ім кіраўніцтва, увёў у свой статут асобны пункт, у якім абвяшчалася, што ідэйным патронам арганізацыі з'яўлецца Ю. Пілсудскі.

Таксама "санацыйныя" ўлады імкнуліся прышчапіць культ свайго правадыра і студэнцкай моладзі, у тым ліку і на тэрыторыі Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя. Аднак увесь міжваенны перыяд ў гэтым асяроддзі дамінавалі праціўнікі "санацыі" з арганізацыі "Усяпольская моладзь", маральным аўтарытэтам якіх з'яўляўся лідар польскіх нацыяналістаў Р. Дмоўскі. Тым не менш, па ініцыятыве Я. Енджэевіча для працы сярод студэнцтва быў створаны Легіён маладых. У сваёй ідэйнай дэкларацыі гэты саюз заявіў, што "лічыць сябе спадкаемцам і пераемнікам незалежніцкага пакалення, якое пад кіраўніцтвам маршала Ю. Пілсудскага заваявала незалежнасць і адбудавала дзяржаўнасць Польшчы". Маршал аб'яўляўся "сімвалам здаровага салдацкага дзеяння і ахвярнай працы для дзяржавы" і ідэйным правадыром Легіёна маладых [10, с. 4]. Аднак значных поспехаў у распаўсюджванні сваіх уплываў на студэнтаў дадзеная арганізацыя не дасягнула.

### Заключэнне

Такім чынам, неабходна прызнаць, што пасля мая 1926 г. культ асобы маршала Ю. Пілсудскага стаў неад'емнай часткай афіцыйнай маладзёжнай палітыкі. Ідэолагі і кіраўнікі "санацыйнага" рэжыма лічылі свайго лідара выхаваўчым ідэалам, узорам для маладога пакалення. У сувязі з гэтым школа 2-й Рэчы Паспалітай вяла актыўную працу па фарміраванню свядомасці моладзі ў духу адпаведнай "лягенды маршала". Адбывалася гэта не толькі непасрэдна ў час навучання, але і праз арганізацыю адпаведных выхаваўчых мерапрыемстваў. Свой уклад у пашырэнне культу асобы Ю. Пілсудскага ўносіла і мясцовае кіраўніцтва сістэмы адукацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Не менш важнае значэнне ў гэтым плане мела і дзейнасць шматлікіх праўрадавых маладзёжных саюзаў і аб'яднанняў. Усе яны, фармальна з'яўляючыся апалітычнымі арганізацыямі, дэкларавалі сваю прыхільнасць "санацыі" і яе лідару. Вынікам гэтага была іх праца па пашырэнню і падтрымцы культа іх ідэйнага патрона – маршала Ю. Пілсудскага.

### *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*

1. ***Skwarczyński, A.*** Myśl wychowawcza Piłsudskiego / A. Skwarczyński // Zrab. – 1930. – T. 13. – S. 9–14.
2. ***Cichoracki, P.*** Legenda i polityka. Kształtowanie się wizerunku marszałka Józefa Piłsudskiego w świadomości zbiorowej społeczeństwa polskiego w latach 1918–1939 / P. Cichoracki. – Kraków : Księgarnia Akademicka, 2005. – 412 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. ***Czerwiński, S.*** Przemówienie na posiedzeniu Sejmu w dn. 10 lutego 1931 r. // O nowy ideał wychowawczy szkoły polskiej / S. Czerwiński. – Warszawa, 1934. – S. 73–85.
4. ***Składanowski, H.*** "Od uwielbienia do negacji" – Józef Pilsudski w podrecznikach historii w szkole powszechnej (podstawowej) w II RP i okresie stalinowskim PRL / H. Składanowski // Wiadomości historyczne. – 2006. – № 5. – S. 30–38.
5. ***Dobaczewska, W.*** Wileńszczyzna i Nowogródczyzna w latach 1920–1937. Sprawy polityczne i społeczne / W. Dobaczewska. – Wilno : Nakładem Dziennika Urzedowego K. O. S. Wil., 1938. – 38 s.
6. ***Kusiak, P.*** Legenda i kult Józefa Pilsudskiego. Jak w Polsce doby integracji europejskiej interpretować postac marszałka? / P. Kusiak // Colloquim wydziału nauk humanistycznych i społecznych. – Rocznik II. – 2010. – S. 241–258.
7. ***Golka, M.*** Wskazania programowe / M. Golka // Praca strzelecka. – 1931. – № 9/12. – S. 11–25.
8. Program dla grup wiekowo-wyszkoleniowych w oddzialach i pododdziałach Zwiazku Strzeleckiego w zakresie wychowania obywatelskiego. – Brześć nad Bugiem, 1937. – 45 s.
9. Sprawozdanie Poleskiego Wojewodzkiego Zwiazku Młodziezy Wiejskiej za rok 1931–1932. – Brześć nad Bugiem, 1933. – 16 s.
10. Deklaracja ideowa Legionu Młodych – Zwiazku Pracy dla Państwa // Jednodniówka Legionu Młodych – Zwiazku Pracy dla Państwa. Obwod Brześć nad Bugiem. – Brześć nad Bugiem, 1933. – S. 4–5.

Поступила в редакцию 06.02.2014 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова